http://edoc.bseu.by

типом жесткого протекционизма во внешнеинвестиционной политике государства.

**Список источников**

1. Baldwin, D. A. Economic Statecraft / D.A. Baldwin. – Princeton: Princeton University Press, 2020. – 455 p.

2. Economic Sanctions Reconsidered. History and Current Policy / G. C. Hufbauer [et al.]. – Washington : Institute for International Economics., 1990. – 270 p.

3. International Investment Implications of Russia’s War Against Ukraine. – Paris : OECD Publishing, 2022. – 28 p.

4. World Investment Report 2022: International Tax Reforms and Sustainable Investment. – New York ; Geneva : UN, UNCTAD, 2022. – 221 p.

5. Дораев, М. Г. Экономические санкции в праве США, Европейского союза и России / М. Г. Дораев. — М. : Инфотропик Медиа, 2016. – 216 с.

6. Международная инвестиционная деятельность : учеб. пособие / Е. Н. Петрушкевич [и др.] ; под ред. Е. Н. Петрушкевич. – Минск : БГЭУ, 2021. – 345 с.

***І.І. Таркан**, старэйшы выкладчык*
*БДПУ ім. М. Танка (Мінск)*
*Навуковы кіраўнік – М.А. Мажэйка, доктар філасофскіх навук, прафесар*
*БДУКіМ (Мінск)*

## БЕЛАРУСКА-ІНДЫЙСКІЯ АДНОСІНЫ ВА УМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ: ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНАЕ ВЫМЯРЭННЕ

Развіццё сусветнай супольнасці ў рамках глабалісцкай мадэлі грунтуецца на каштоўнасных арыенцірах, якія скláліся ў заходняй цывілізацыі і таму адлюстроўваюць культурныя асаблівасці, уласцівыя яе гістарычнай дынаміцы. Спроба надаць дадзеным арыенцірам імператыўна-універсалісцкі характар выклікае супрацьдзеянне з боку незаходніх краін і падвяргаецца ўсё большай крытыцы ў сучасных сацыяльна-гуманітарных ведах.

У сувязі з гэтым адзначаецца, што згодна з еўрацэнтрызмам «агульначалавечыя каштоўнасці» разглядаюцца толькі ў нормах палітычнага, прававога і сацыяльна-эканамічнага жыцця сучаснага Захаду. Тым самым ігнаруюцца культурныя дасягненні іншых народаў і, перш за ўсё, вялікіх цывілізацый Усходу, асабліва тых, якія з'яўляюцца альтэрнатыўнымі ў адносінах да сучасных тэндэнцый развіцця заходняй цывілізацыі, якая ўвяла

чалавецтва ў тупік глабальнага экалагічнага, палітычнага і сацыяльна-эканамічнага крызісу. [5, с. 395–397].

Цывілізацыяй, якая адыгрывае важную геапалітычную ролю і прадстаўляе альтэрнатыву глабалісцкай мадэлі свету з'яўляецца індыйская. Як вядома, культурную аснову індыйскага грамадства складаюць прынцыпы, сфармуляваныя ў ведах – санскрыцкіх, філасофска-рэлігійных тэкстах. Адным з галоўных прынцыпаў развіцця шматвяковай індыйскай цывілізацыі з'яўляецца выкладзены ў Ішапанішад прынцып, вядомы як ішавасйям ідам сарвам – «кожны павінен карыстацца толькі тым, што яму неабходна і выдзелена яму як яго доля, і не замахвацца ні на што іншае» [2, с. 19].

Асаблівую актуальнасць гэты прынцып набывае ва ўмовах дынамікі сучаснай заходняй супольнасці з яе арыентацыяй на палітычны і эканамічны экспансіянізм.

Знаходзячыся ў цэнтры Еўропы і, з прычыны гэтага адчуваючы інтэнсіўны ціск з боку заходняй супольнасці, Беларусь развівае адносіны з альтэрнатыўнымі сусветнымі цэнтрамі палітычнага, эканамічнага і культурнага ўплыву, у тым ліку з Індыяй.

Актыўны інтарэс да Індыі склаўся ў Беларусі яшчэ ў савецкі перыяд. Урад Савецкага Саюза мэтанакіравана фармаваў у грамадзян стаўленне да Індыі як да сяброўскай краіны, якая змагаецца за сацыяльныя пераўтварэнні. Савецкая прэса прапагандавала героіка-рамантычныя выявы індыйскіх палітычных лідэраў – М. Гандзі, Дж. Неру. Шырока перакладаліся і публікаваліся творы Р. Тагора. Замацаванню рамантычнай выявы Індыі ў свядомасці савецкіх грамадзян спрыялі візіты яе лідэраў у Савецкі Саюз: І. Гандзі – у 1963, 1976 і 1982 гг., Р. Гандзі – у 1985 г. (прычым апошні наведваў менавіта Беларусь) [1; 3; 11].

Неўзабаве пасля набыцця Беларуссю суверэнітэту ў маі 1992 г. у Мінску было адкрыта дыпламатычнае прадстаўніцтва Індыі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка наведаў Індыю з дзяржаўнымі візітамі ў верасні 1997 г., красавіку 2007 г. і верасні 2017 г. У чэрвені 2015 г. адбыўся першы ў гісторыі двухбаковых адносін візіт Прэзідэнта Рэспублікі Індыя П. Мукерджы ў Беларусь.

У ходзе візіту А. Р. Лукашэнкі ў Індыю ў 1997 г. былі закладзены асновы для доўгатэрміновых беларуска-індыйскіх адносін у гандлёва-эканамічнай і навукова-тэхнічнай сферы [8].

У пачатку 2000-х гг. у Індыі створана таварыства беларуска-індыйскага сяброўства. Цяпер таварыства дружбы «Індыя-Беларусь» аб'ядноўвае значную колькасць бачных індыйскіх палітыкаў, грамадскіх дзеячаў і бізнесменаў [6].

У час наведвання Індыі А. Р. Лукашэнка ў 2007 г. быў падпісаны шэраг дакументаў па супрацоўніцтве ў галіне сельскай гаспадаркі, культуры,

мастацтва, адукацыі, сродкаў масавай інфармацыі і друку, падпісана выканаўчая праграма супрацоўніцтва ў галіне навукі і тэхнікі [4].

У 2017 г. па выніках візіту кіраўніка беларускай дзяржавы ў Індыю вызначаны пералік прыярытэтных праектаў у галіне адукацыі, машынабудавання, сельскай гаспадаркі, навукі і тэхнікі, фармацэўтыкі, нафтаздабычы, калійных угнаенняў, інвестыцыйнага і іншага супрацоўніцтва [9].

Для абмеркавання актуальных праблем двухбаковага супрацоўніцтва на міжурадавым узроўні створана Беларуска-Індыйская міжурадавая камісія па супрацоўніцтве ў галіне эканомікі, гандлю, прамысловасці, навукі, тэхналогій і культуры. Дзелавыя колы Індыі праяўляюць значную цікавасць да супрацоўніцтва з Беларуссю ў галіне паставак лекаў, гарбаты, спецый, арганізацыі сумесных вытворчасцей у Індыі на базе беларускіх тэхналогій і абсталявання ў сферы мікраэлектронікі, оптыкі, машынабудавання [6]. У 2017 г. Міжурадавай камісіяй быў арганізаваны Беларуска-Індыйскі бізнес-форум, удзельнікамі якога была прадстаўлена канцэпцыя беларуска-індыйскага інвестыцыйнага кластара ў Аршанскім раёне Віцебскай вобласці [7].

Паспяхова развіваецца беларуска-індыйскае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва. Каардынацыю гэтага супрацоўніцтва ажыццяўляе двухбаковая міжурадавая камісія па супрацоўніцтве ў галіне навукі і тэхнікі [6].

У сферы гандлёва-эканамічных адносін большая частка беларускага экспарту ў Індыю прыпадае на калійныя ўгнаенні. У той жа час хуткімі тэмпамі расце і высокатэхналагічны складнік экспарту, куды ўваходзяць такія тавары, як хімічныя валокны, аптычныя прыборы, кантрольна-вымяральнае абсталяванне, металаапрацоўчыя станкі [6].

Індыя і Беларусь падзяляюць агульныя падыходы да вырашэння многіх праблем сучаснасці. Краіны паспяхова супрацоўнічаюць у рамках міжнародных арганізацый: ААН, Руху Недалучэння. Актыўна развіваецца міжпарламенцкае супрацоўніцтва. Парламентарыі дзвюх краін канструктыўна супрацоўнічаюць у рамках Міжпарламенцкага саюза [6].

Пазіцыі Беларусі і Індыі блізкія па асноўных пытаннях падтрымання міжнароднага міру і бяспекі, падыходах да рэалізацыі парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 г., а таксама рашэнняў асноўных міжнародных самітаў і канферэнцый [10].

Беларусь і Індыя канструктыўна супрацоўнічаюць па пытаннях правоў чалавека ў ААН. Індыя з'яўляецца членам Групы сяброў, якія аб'ядналіся ў барацьбе з гандлем людзьмі, і пастаянным суаўтарам беларускіх рэзалюцый па барацьбе з гандлем людзьмі. Беларусь падтрымала ініцыятыву Індыі аб абвяшчэнні 21 чэрвеня Міжнародным днём йогі. Краіны рэгулярна падтрымліваюць адна адну на выбарах у органы і ўстановы сістэмы ААН [10].

Такім чынам, Беларусь і Індыя маюць доўгую і насычаную гісторыю супрацоўніцтва. Адметна, што асновай такога супрацоўніцтва з'яўляецца не толькі эканамічная і палітычная мэтазгоднасць, але і тое, што абедзве краіны прытрымліваюцца прынцыпаў, заснаваных на ўзаемнай павазе каштоўнасных арыенціраў адна адной. Такая мадэль дае магчымасць паглыбляць працэсы міжкультурнага дыялога дзвюх краін, адкрываючы больш шырокія перспектывы для далейшага ўзаемадзеяння.

### Спіс крыніц


1. Беларусь является важным международным партнером Индии [Электронный ресурс] // Коммунистическая партия Беларуси. – Режим доступа: https://news.tut.by/society/444705.html. – Дата доступа: 5.01.2018.

2. Бхактиведанта Свами Прабхупада, А. Ч. Шри Ишопанишад / А. Ч. Бхактиведанта Свами Прабхупада. – М. : The Bhaktivedanta Book Trust, 2011. – 176 с.

3. Визит Индиры Ганди в СССР [Электронный ресурс] // Библиотека изображений : РИА Новости Медиабанк. – Режим доступа: https://riamediabank.ru/media/146530.html. – Дата доступа: 15.11.2022.

4. Завершились официальные визиты в Султанат Оман и Индию [Электронный ресурс] // Президент Республики Беларусь : официальный Интернет-портал Президента Республики Беларусь. – Режим доступа: https://president.gov.by/ru/events/zavershilis-ofitsialnye-vizity-v-sultanat-oman-i-indiju-2615. – Дата доступа: 15.11.2022.

5. Кузнецов, А. В. Практикум по философии : Социальная философия / А. В. Кузнецов, В. В. Кузнецов. – Минск : АСАР, 2007. – 832 с.

6. О белорусско-индийских отношениях [Электронный ресурс] // Министерство иностранных дел Республики Беларуси. – Режим доступа: https://mfa.gov.by/press/news_mfa/f41cf28d4250e812.html. – Дата доступа: 15.11.2022.

7. О Белорусско-Индийской Межправительственной комиссии по сотрудничеству в области экономики, торговли, промышленности, науки, технологий и культуры [Электронный ресурс] // Министерство иностранных дел Республики Беларуси. – Режим доступа: https://www.mfa.gov.by/press/news_mfa/bf744b1192a97291.html. – Дата доступа: 15.11.2022.

8. Официальный визит в Индию [Электронный ресурс] // Президент Республики Беларусь : официальный Интернет-портал Президента Республики Беларусь. – Режим доступа: https://president.gov.by/ru/events/oficialnyy-vizit-v-indiyu. – Дата доступа: 15.11.2022.

9. Официальный визит в Республику Индия [Электронный ресурс] // Президент Республики Беларусь : официальный Интернет-портал Президента Республики Беларусь. – Режим доступа: https://president.gov.by/ru/events/ofitsialnyj-vizit-v-respubliku-indija-17025. – Дата доступа: 15.11.2022.

10. Политические отношения между Республикой Беларусь и Республикой Индия [Электронный ресурс] // Посольство Республики Беларусь в Республике Индия. – Режим доступа: https://india.mfa.gov.by/ru/bilateral_relations/political/. – Дата доступа: 15.11.2022.

11. СССР – Индия, могучее дерево дружбы [Электронный ресурс] // Документальный фильм. 1982. Реж.: А.Павлов. Текст: В.Тарасов. Производство: ЦСДФ (СССР). – Режим доступа: https://www.net-film.ru/film-8693. – Дата доступа: 05.01.2018.